Леванцэвіч Л.В. (Брэст, Беларусь)

# ГАВОРКІ ІВАНАЎСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Гаворкі Іванаўскага раёна адносяцца да заходнепалескіх (брэсцка-пінскіх) гаворак беларускай мовы. Адметнасцю заходнепалескіх гаворак з'яўляецца стракатасць іх узаемнага тэрытарыяльнага размяшчэння. Расчлянёнасць, дробнасць іх тэрытарыяльных частак і іх цераспалосіца з'явіліся прычынай таго, што неабхода было правесці спецыяльнае лінгвагеаграфічнае даследаванне заходнепалескіх гаворак. Грунтоўнае вывучэнне і групоўка гаворак па найбольш яркіх фанетычных асаблівасцях была праведзена ў 60–70-я гады XX ст. Ф.Д. Клімчуком. Гаворкі Іванаўскага раёна ён аднёс да загародскіх гаворак. Загародскія гаворкі складаюцца з чатырох разнавіднасцей: сярэднезагародскіх, паўночназагародскіх, тараканскіх і паўднёвазагародскіх. Летам 2013 года падчас дыялекталагічнай практыкі намі праводзіўся збор дыялектнага матэрыялу ў палявых умовах на тэрыторыі Іванаўскага раёна. Апрацаваны і скласіфікаваны матэрыял паказаў, што на даследуемай тэрыторыі пашыраны тры разнавіднасці загародскіх гаворак: сярэднезагародскія, тараканскія і паўднёвазагародскія.

Іванаўскі раён размешчаны на поўдні Брэсцкай вобласці. Паўночная і паўднёвая часткі тэрыторыі знаходзяцца на заходняй ускраіне Прыпяцкага Палесся. Па тэрыторыі працякаюць рэкі Піна, Няслуха, Піліпаўка, Ясельда, праходзіць Дняпроўска-Бугскі канал і меліярацыйныя каналы Завішчанскі, Заазерскі, Залядынскі, Моладаўскі і Ясельдаўскі, размешчаны азёры Акуніна, Безыменнае, Завішчанскае, Мотальскае, Мульнае, Пясчанае, Скупое, вадасховішчы Джыдзінне, Крытышын, Ляскавічы, Рудск, Гнеўчыцы. На тэрыторыі раёна часткова размешчаны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння Спораўскі і мясцовага значэння Аброва і Завышанскі. На Іванаўшчыне выяўлены археалагічныя стаянкі IX–III тыс. да н.э., эпохі неаліту і бронзы ў вёсках Моталь, Опаль, Тышкавічы. Сучасныя дыялектныя адзінкі даследуемай тэрыторыі супадаць з гнёздамі канцэнтрацыі археалагічных помнікаў. Відаць, гнёзды помнікаў адпавядаюць невялікім племянным групам, дыялекты якіх адрозніваліся паміж сабою: мотальскае гняздо – сярэднезагародскія гаворкі, опальскае – тараканскія гаворкі, тышкавіцкае – паўднёвазагародскія гаворкі. Межы трох груп гаворак праходзяць па паўночнай частцы даследуемай тэрыторыі. Тараканскія гаворкі ўтвараюць невялікі масіў на паўночным захадзе Іванаўскага раёна (вв. Туляцічы, Опаль, Вартыцк); паўднёвазагародскія – невялікі масіў на паўночным усходзе (вв. Тышкавічы, Калілы, Панцавічы); астатнюю (асноўную, большую частку) тэрыторыю займаюць сярэднезагародскія гаворкі (Моталь, Стрэльна, Дастоева, Пятровічы, Адрыжын, Вулька і інш.). Якраз у гэтым рэгіёне Іванаўшчыны размешчаны асноўныя балотныя масівы (Спораўскія балоты), сканцэнтраваны азёры (Мульнае, Мотальскае, Скупое, Джыдзінне), працякае рака Ясельда, якая з'яўлялася этнічнай мяжой паміж

славянамі і балтамі. Магчыма, гэтыя прыродна-ландшафтныя фактары таксама наклалі адбітак на фарміраванне дыялектных груп.

Гаворкі большасці населеных пунктаў Іванаўскага раёна адносяццца да сярэднезагародскіх. Значны тэрытарыяльны абшар гэтых гаворак знаходзіцца ў Іванаўскім раёне і на сумежжы з ім на захадзе Пінскага раёна.

Адной з найбольш значных прыкмет сярэднезагародскіх гаворак, як і ўсіх заходнепалескіх, з'яўляецца захаванне галоснага [о] ў ненаціскным становішчы, ці оканне: *головá, молокó, дорóга, корóва*.

Галосны [у] ў некаторых гаворках гэтага віду вымаўляецца ў адпаведнасці з націскным [о] ў пераднаціскных складах (уканне): *мулукó, курóва, дурóга, кулы́, нусю́* (в. Сухое). Калі перад [о] або пасля яго мае месца губны зычны, то галосны рэалізуецца таксама як [у]: *рубы́ты, пурáдок* (в. Сухое). Аднак галосны [у] тут больш пашыраны на месцы [о] ў адкрытых складах: *кут, буб, вуз*. У некаторых гаворках у паслянаціскным становішчы [у] ўжываецца на месцы *е: *бэ́руг, вэ́чур* (в. Радаўня).

Сярэднезагародскія гаворкі вызначаюцца наяўнасцю гука [і] на месцы *ѣ (ікавізм): *л'і́то, с'м'іх, ц'іп, тоб'і́*. Галосны [і] вымаўляецца тут і на месцы [о] ў адкрытых складах: *ст'іл, в'із, к'ін', ж'і́нка, б'іл'ш, н'іс, с'і́но*. Гук [і] мае месца і на месцы галоснага [е] пад націскам і галоснага [і] з *ѣ: *т'іпéр, н'іхáй, с'н'іжóк, п'ісóк, нóз'іро*.

Кансанантызм сярэднезагародскіх гаворак вылучаецца пашырэннем мяккіх зычных. Мяккія зычныя паслядоўна выступаюць перад націскным [і] ў адпаведнасці з мінулым *ѣ: *об'і́д, с'в'іт, д'ід, л'і́то*.

Мяккія губныя, заднеязычныя, [ж], [ш], [ч], [р], [ц] маюць месца перад націскным [і], які адпавядае *о: *в'іл, тв'ій, тх'ір, ж'і́нка, пч'і́лка, гр'іх, пор'і́зав*.

Мяккія [ж], [ш], [ч], [р] вымаўляюцца перад галосным [а] пад націскам: *ж'áба, ш'áпка, кр'ічáты, ч'áс*.

У становішчы перад націскным і ненаціскным [а] выступаюць цвёрдыя губныя [б], [п], [в] у спалучэнні з наступным [й], а [м] – з наступным мяккім [н]: *пйáтка, свйáто, ж'ір'ібйá, сымн'á, зымн'á*.

У гаворках пашырана ўжыванне мяккага гука [ц']: *ц'ац'óк, рукавы́ц'у, хлóпыц'*.

У большасці гаворак захаваліся спалучэнні *гы, *кы, *хы: *дóвгы, корóткы, тóнкы, ты́хы*.

Зваротныя дзеясловы ў сярэднезагародскіх гаворках ужываюцца з постфіксам -са: *боюса, купáюса, зробы́лоса, мы́тыса, брáтыса, звáтыса*.

Назоўнікі жаночага роду адзіночнага з асновай на цвёрды зычны ў месным склоне маюць канчатак -ы: *в хáты, на лопáты*; з асновай на [г], [к], [х] – -і: *на ноз'і́, на руц'і́*.

Прыметнікі ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку ніякага роду маюць націскны канчатак -е: *молодé, старé*.

У сярэднезагародскіх гаворках асновы дзеясловаў заканчваюцца на губны + л ва ўсіх асабовых формах ( на ўзор першай асобы адзіночнага ліку): *купл'ý, робл'ý, кýпл'ат', рóбл'ат'*.

**Тараканскія** гаворкі ў галіне націскнога вакалізму характарызуюцца наяўнасцю гука [і] на месцы *һ: *л'іс, ц'іп, на руц'í.*

Адной з найбольш адметных асаблівасцяў з'яўляецца вымаўленне ў становішчы пад націскам галоснага гука [е], у тых умовах, у якіх у іншых загародскіх гаворках выступае галосны [і]/[ы]: *сэн, бэк (бык), хэ́трый, ходэ́в, рэ́ба, жэ́то, робэ́тэ, вэ́тэ.* Да ліку характэрных адносіцца і вымаўленне гука [е] ў адпаведнасці з галосным [а] пасля мяккіх зычных у іншых загародскіх гаворках: *ж'éба, ш'éпка, вз'ев, з'ет', мн'éсо.*

Спецыфічнай асаблівасцю з'яўляецца і рэалізацыя галоснага [а] ў адпаведнасці з [е] ў іншых гаворках: *мад, ба́рог, ва́чур, па́ршы, на́бо.*

Для **паўднёвазагародскіх** гаворак характэрны гук [е] пад націскам пасля мяккіх зычных: *т'éжко, пйет', ж'éба.*

Гук [і] вымаўляецца на месцы націскнога *һ, а таксама на месцы *о ў закрытых складах: *л'іс, хл'іб, к'ін', в'ін, б'іл'ш.*

Характэрны мяккі гук [ц']: *рукавы́ця, па́ліць, ця́цька.* Але шумныя і [р] тут цвёрдыя: *часы́, прадэ́, на́ша, шум, чо́боты.*

Гаворкі Іванаўскага раёна вылучаюцца і адметнай лексікай: *узро́м, здер'і* 'ніжняя частка снапа', *отрэ́пы* 'кастрыца', *лукашы́* 'буякі', *йа́г'ір* 'аер', *квашéл'н'а* 'халадзец', *кубло́* 'гняздо', *страмына* 'драбіны' і інш.